# «Край любы мой Клецкі»

**Прысвячаецца 890-годдзю г. Клецка**




**Па гарызанталі:** **1.** Літаратурнае аб'яднанне, якое існуе пры клецкай раённай газеце «Да новых перамог». **5.** ... Будны. Імя беларускага асветніка XVI стагоддзя, які працаваў у г. Клецку прапаведнікам і дзе падрыхтаваў да друку сваю беларускамоўную працу «Катэхізіс». **7.** ... Мудры. Імя кіеўскага князя, сына полацкай княгіні Рагнеды, які ў XI стагоддзі пабудаваў на беразе р. Лані , на месцы сённяшняга г. Клецка, драўляны замак. **8.** Род рэшата. **9.** Месца спуску (разм.). **11.** Славянскае племя, з паселішча якога ўзнік г. Клецк, які ўпершыню ўпамінаецца ў летапісах з 1127 года. **12.** Музычны інструмент з трыснягу або з дрэва. **14.** Цяслярская сякера. **16.** У старажытнай Беларусі сход. **17.** Колючая зброя, від кап'я. **20.** Надкаленная косць. **22.** ... любяць лік, а хлеб — меру (прык.). **23.** Магутны магнацкі на Беларусі род, прадстаўнікі якога ўладарылі на Клеччыне з XVI стагоддзя аж да 1939 года. **27.** Не язык, а ... з перцам (прык.). **28.** Куст бульбы, вывернуты з зямлі. **29.** «Мой родны ... — не закуточак,//Тут кветкі пышней і азёры святлей.//Край любы мой Клецкі, часткова — палескі —//Цудоўна прыгожы, няма даражэй». З верша клецкай паэткі, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Л. Мялешкі. **30.** Тое, што заставалася ад г. Клецка пасля набегаў крымскіх татар, пасля захопу горада ваярамі Масковіі і Швецыі ў 1258, 1655 і 1706 гадах. **31.** Рукам ..., душы — свята (прык.).

**Па вертыкалі:** **1.** Назва першага снапа на зажынках, які лічыўся імянінным. **2.** ... — гарачая пара. **3.** «...-самалёты//Свідруюць прастор». З верша Я. Купалы «Заўсёды наперад». **4.** Сістэма блокаў для падымання грузаў на судна. **6.** ... Глінскі. Імя князя ВКЛ, які камандаваў войскам у час Клецкай бітвы 6 жніўня 1506 года. Перамога яго войска над крымскімі татарамі паклала канец набегам татар на Беларусь. **10.** Купальскі .... Добры дух, які, паводле павер'яў, ходзіць і збірае купальскія зёлкі. **13.** Адна з старажытных назваў г. Клецка. **15.** Ян ... . Кароль Польшчы і Вялікі князь ВКЛ, які 27 жніўня 1652 года надаў г. Клецку герб і Магдэбургскае права. **18.** Вялікі продаж тавару, якім з даўніх часоў славіўся г. Клецк. **19.** «Клецкая ...». Клецкае прадпрыемства па вырабе высакаякаснай малочнай прадукцыі. **21.** ... рады квету, а людзі — лету (прык.). **24.** Выдавецкая і друкарская справа; у г. Клецку друкарня была адкрыта ў пачатку XX стагоддзя. **25.** Духоўны кіраўнік у мусульман. **26.** ... Сфорца. Каралева Польшчы і вялікая княгіня ВКЛ, якая правіла г. Клецкам з 1523 па 1556 год; у час яе праўлення была праведзена аграрная рэформа.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.** *г. Дзяржынск.*

**Праверце, калі ласка, адказы:**

**Па гарызанталі:** **1.** «Голас». **5.** Сымон. **7.** Яраслаў. **8.** Сіта. **9.** Сход. **11.** Дрыгавічы. **12.** Дудка. **14.** Склюд. **16.** Веча. **17.** Піка. **20.** Рэпка. **22.** Грошы. **23.** Радзівілы. **27.** Шыла. **28.** Корч. **29.** Куточак. **30.** Руіны. **31.** Праца.

**Па вертыкалі:** **1.** Гаспадар. **2.** Лета. **3.** Арлы. **4.** Талі. **6.** Міхаіл. **10.** Дзядок. **13.** Клеческ. **15.** Казімір. **18.** Кірмаш. **19.** Крынічка. **21.** Пчолкі. **24.** Друк. **25.** Імам. **26.** Бона.

■ Ноу-хау ад культуры

# СПАДАРЫНЯ БРЭГМАН З ДОМА ПА ВУЛІЦЫ МАРЫІНСКАЙ

## Як у Баранавіцкім краязнаўчым музеі наведвальнікаў прыцягваюць

**У складзе адной дэлегацыі давялося пабываць у Баранавіцкім краязнаўчым музеі. Падумалася тады: радавое наведванне аб'екта ў рамках культурнай праграмы. Аказалася — адкрыццё.**

Музей па вуліцы Савецкай, былой Марыінскай, знаходзіцца ў доме, якому больш за сто гадоў. І сустракала нас яго гаспадыня пачатку XX стагоддзя — спадарыня Брэгман. Мілавідная дама ў шэрай сукенцы з каўняромстойкай нібы сышла са старых фотаздымкаў. А як гаварыла! Гэта быў не завучаны тэкст, які прамаўляла музейная работніца ў касцюме той эпохі, гэта была жывая сцэна, удала сыграная таленавітымі асобамі. Спадарыня Брэгман разам са служанкай Кацярынай змаглі паднесці такі «смачны» гістарычны прадукт наведвальнікам, што тыя мусілі ўважліва слухаць, удзельнічаць, здзіўляцца.

Карцінка з жыцця невялікага тады горада Навагрудскага павета часоў Першай сусветнай вайны жыва паўстала перад вачыма: як жылі людзі, аб чым хваляваліся, якое адзенне насілі, што куплялі ў местачковых крамах. А ўжо служанка Кацярына ў выкананні мастака-рэстаўратара Наталлі Качкарык стала проста знаходкай названага сюжэта. Уся тэатральная дзея праходзіць на рускай мове, што адпавядае рэчаіснасці. А пакаёвая работніца, вядома, з местачковых, і яе сакавітая вясковая гаворка разам з народным гумарам і прыроджанай артыстычнасцю проста зачароўвалі. Я глядзела на яе і думала пра наш брэсцкі штогадовы тэатральны фестываль... Аказалася, не я адна такая. Пасля першага ж прадстаўлення спадарыню Наталлю запрасілі ў адзін з самадзейных тэатраў Баранавіч.


У паэтычным салоне спадарыні Брэгман.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

**Галоўны наглядчык фондаў Рыта ЧАРТКО** ў вобразе спадарыні Брэгман расказала цікавую гісторыю наведвання імператарам Баранавіч, сведчаннем таму паслужылі ўнікальныя кадры дакументальнай кінахронікі, якія ўбачылі госці музея. Але ж які панскі дом той пары без музычнага альбо паэтычнага салона? І ў Брэгманаў ён, несумненна, быў. І там чытала вершы Ахматавай ды Гумілёва рамантычная паненка, выкладчыца тутэйшай гімназіі Ганна Мікалаеўна, якую ўдала прадстаўляла **музейны работнік Алена БЫЧКО**.

— Самае цікавае, што ўсе гэтыя персанажы не прыдуманыя, людзі з такімі прозвішчамі, імёнамі жылі ў Баранавічах, — расказала карэспандэнту газеты **дырэктар музея Ала САМУШЧАВА**. — Навуковыя супрацоўнікі пры распрацоўцы сцэнарыя кіраваліся дакументамі з архіваў. Менавіта Брэгманам належаў дом па вуліцы Марыінскай. І, вядома, у іх мог бываць унтэр-афіцэр чыгуначнай брыгады інжынерных войскаў Аляксандр Зверынцаў, а таксама сціплая выкладчыца літаратуры з гімназіі.

Касцюмы шылі таксама не са столі. Уважліва вывучалі паштоўкі і фотаздымкі той пары, менавіта з іх рысавалі эскізы вопраткі. Усё мае пад сабой гістарычную падставу. Вось толькі Кацярынка — персанаж, прыдуманы аўтарамі сцэнарыя, але ж яна вельмі ўдала ўпісалася ў агульны аповед. У рэшце рэшт у доме была прыслуга. І, вядома, пакаёвак набіралі з мясцовых. Так што гэтая прыдуманая гераіня, можа, нават бліжэйшая да рэальнасці за многіх іншых.



Як наведвальнік, магу сведчыць, што такі экскурс пакідае значна больш уражанняў, чым прывычны нам аповед музейнага гіда, таму і запамінаецца лепш. А дырэктар гаворыць, што час пыльных паліц і старых экспанатаў праходзіць. Музеі цяпер шукаюць шлях да сэрцаў гледачоў з дапамогай рэканструкцый падзей, інтэрактыву, іншых сучасных прыёмаў. Так было і на Дзень горада, да якога краязнаўчы музей прымеркаваў сваю Ноч музеяў. Тады выйшлі на вуліцу, былую Марыінскую, з рознымі экспанатамі. Старыя рэчы паказвалі прахожым дзяўчаты-падлеткі з мадэльнай школы, апранутыя ў сукенкі 30—40 гадоў. І здарыўся сапраўдны фурор. Да музея прыйшлі тысячы людзей, усе хацелі сфатаграфавацца з рарытэтамі, з юнымі мадэлямі. Менавіта там, на вуліцы, упершыню правялі міні-апытанне грамадскай думкі наконт магчымай змены назвы вуліцы Савецкай на былую Марыінскую. У асноўным гараджане падтрымлівалі. «Магчыма, прыйдзе час, калі гэтую ініцыятыву мы вынесем на разгляд гарвыканкама. Надта ж прыгожая назва, вартая таго, каб да яе вярнуцца», — заўважыла дырэктар музея.

А пакуль музейныя работнікі занятыя распрацоўкай канцэпцыі абнаўлення сваёй установы і новымі актыўнымі праектамі накшталт экскурсіі па горадзе ў суправаджэнні графіні Развадоўскай. Менавіта яна стаяла ля вытокаў заснавання адносна маладога горада Баранавічы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*
*Баранавічы*

Даты | Падзеі | Людзі

### 1 ЛІПЕНЯ

*Міжнародны дзень Дняпра.*

**1569** год — была заключана Люблінская унія, дзяржаўны саюз паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польскім каралеўствам, у выніку чаго была створана федэратыўная дзяржава — Рэч Паспалітая. Перадумовамі гэтага саюза былі працяглае існаванне персанальнай уніі ВКЛ і Польшчы, пачынаючы з Крэўскай уніі 1385 года, паступовае збліжэнне палітычных і дзяржаўных інстытутаў абедзвюх дзяржаў, у асноўным адзіная палітыка ў міжнародных адносінах, адзіная адміністрацыя каталіцкай царквы. Непасрэднай прычынай заключэння Люблінскай уніі былі няўдачы арміі ВКЛ у Лівонскай вайне 1558—1583 гадоў. Паводле акта Люблінскай уніі на чале Рэчы Паспалітай стаяў польскі кароль (ён жа — вялікі князь літоўскі), якога пажыццёва выбірала шляхта. Уладу караля абмяжоўваў агульны сейм з дзвюх палат. Адмяняліся пошліны на мяжы паміж Польшчай і ВКЛ. Дзяржаўныя і мясцовыя пасады ў абедзвюх дзяржавах маглі займаць толькі мясцовыя ўраджэнцы. Абедзве дзяржавы захавалі свой суверэнітэт, асобныя дзяржаўныя адміністрацыі, арміі, судовыя апараты, прававыя, фінансавыя і мытныя сістэмы. Кожная з дзяржаў мела сваю дзяржаўную мову. Унія фактычна існавала да 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (24 кастрычніка 1795 года).

**1804** год — нарадзілася Жорж Санд (Амандзіна Аўрора Люсіль Дзюпэн), французская пісьменніца. Аўтар раманаў «Індыяна», «Кансуэла» і інш., мемуараў «Гісторыя майго жыцця». Памерла ў 1876 годзе.



**1880** год — на ахвяраванні жыхароў г. Мінска было адкрыта Мінскае рэальнае вучылішча. Утрымлівалася за кошт платы за навучанне і дапамогі з казны. Пры вучылішчы меліся бібліятэка, фізічны, гістарычны, механічны кабінеты, кабінет для малявання, лабараторыя і асобны корпус для заняткаў гімнастыкай. Вучэбнай праграмай прадугледжваліся экскурсіі на фабрыкі і заводы горада. Выпускнікі вучылішча паступалі ў Пецярбургскі, Маскоўскі, Харкаўскі тэхналагічныя і Рыжскі політэхнічны інстытуты. Сярод выпускнікоў вучылішча быў народны артыст СССР Б. Платонаў. У 1891 годзе было рэарганізавана ў аддзяленне для падрыхтоўкі выхаванцаў да паступлення ў спецыялізаваныя ВНУ Расійскай імперыі (пераважна ў тэхналагічныя інстытуты). Існавала да 1917 года.

**1889** год — нарадзілася Вера Ігнацьеўна Мухіна, савецкі скульптар, народны мастак СССР, правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР. Аўтар манументальнай скульптуры «Рабочы і калгасніца». Таксама афармляла выставы і тэатральныя спектаклі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1941, 1943, 1946, 1951, 1952). Памерла ў 1953 годзе.

**1967** год — нарадзілася (г. Мінск) Ірына Валер'еўна Казакова, беларуская фалькларыстка, доктар філалагічных навук. Даследуе гісторыю культуры беларусаў, этнічныя традыцыі, міфалогію, магію, тэматычную разнастайнасць і паэтыку асноўных жанраў беларускага абрадавага фальклору, паходжанне і спецыфіку беларускай вуснай паэзіі, сімволіку і семантыку славянскай міфалогіі.

Было сказана

**Рыгор БАРАДУЛІН, народны паэт Беларусі:**

*«Той свет*
*Цікавіць нас на гэтым свеце,*
*А ці ўзгадаем*
*Гэты свет на тым?..»*

■ Калейдаскоп

## Дыназаўры не вернуцца на Зямлю

**Серыя фільмаў «Парк юрскага перыяду», запушчаная амаль чвэрць стагоддзя таму Стывенам Спілбергам, ускалыхнула велізарную колькасць дыназаўралюбаў, ахвочых пафантазіраваць на тэму павароту эвалюцыі назад.**



Тэорыя адраджэння дыназаўраў шляхам кланавання, паказаная ў фільме, да гэтага часу выглядае даволі рэалістычна, і поспехі на ніве кланіравання жывёл, здавалася, вось-вось дазволяць навукоўцам вярнуць дагістарычных яшчараў на Зямлю. Аднак група палеантолагаў з Манчэстэрскага ўніверсітэта перакрэсліла гэтыя спадзяванні і расказала, чаму Парк юрскага перыяду пакуль не з'явіцца ў рэальным свеце.

Раней меркавалася, што для «ўваскрашэння» дыназаўраў будзе дастаткова фрагментаў генетычнага матэрыялу, ацалелых да нашага часу. Напрыклад, ладзіўся маштабны эксперымент па адраджэнні тыраназаўра з выкарыстаннем калагену, вылучанага з астанкаў старажытнага яшчара. Паводле слоў доктара Майка Баклі з Манчэстэрскага ўніверсітэта, выяўленне бялкоў у костках дыназаўраў выклікала надзвычайнае ўзрушэнне як сярод навукоўцаў, так і сярод грамадскасці: «Было падобна, што выдумка можа стаць рэальнасцю дзякуючы ўжыванню новых тэхналогій».

Аднак усё аказалася далёка не так аптымістычна. Каманда экспертаў з Манчэстэра прааналізавала сляды калагену ў астанках тыраназаўра, каб высветліць, ці сапраўды гэта рэчыва можна выкарыстоўваць для кланавання. У ходзе эксперыменту высветлілася, што выдзелены калаген адпавядае... калагенам страусаў, так што выкарыстоўваць гэты арганічны матэрыял не мае сэнсу. Адсутнасць у костках дыназаўраў неабходных біялагічных малекул робіць немагчымым «уваскрашэнне» яшчараў пры дапамозе сучасных метадаў. Для рэалізацыі падобнай задумкі патрэбны паўнавартасны генетычны матэрыял, — а ўлічваючы мільёны гадоў, што мінулі з часу гібелі дыназаўраў, шанцы знайсці яго практычна роўныя нулю.

## 5250 адценняў сіняга

**Тэхналогіі, вынайдзеныя некалькі тысяч гадоў таму ў Старажытным Егіпце, плануецца выкарыстоўваць у сучаснай крыміналістыцы. Гаворка ідзе пра інтэнсіўную сінюю фарбу «сіняя фрыта», або проста «егіпецкая сіняя».**

Як паказалі нядаўнія даследаванні, гэтая фарба, створаная са сплаву пяску з мелам, прыроднай крышталічнай содай і вокісам медзі, можа замяніць парашок для зняцця адбіткаў пальцаў, паколькі яна паказвае выдатныя вынікі там, дзе традыцыйныя сродкі не працуюць. Спачатку вучоныя зацікавіліся стойкасцю створанай 5250 гадоў таму егіпецкай сіняй, якая да сёння пакрывае старажытныя саркафагі і сцены магільняў. У працэсе даследаванняў высветлілася, што сіні пігмент пры пэўным асвятленні пускае інфрачырвонае выпраменьванне блізкага спектра.


Егіпецкую сінюю, як пісаў яшчэ ў I стагоддзі да нашай эры рымскі архітэктар і механік Вітрувій, атрымлівалі, калі награвалі сумесь медзі, кварцавага пяску, вапны і прыроднай крышталічнай соды.

Гэта ўласцівасць фарбы можа быць карыснай для правядзення судовай экспертызы. Звычайна крыміналісты на месцы злачынства наносяць на прадметы спецыяльным пэндзлікам кантрасны парашок, які прыліпае да пакінутых адбіткаў пальцаў. Але адбіткі складана, а часам і зусім немагчыма, атрымаць з глянцавых або рэльефных паверхняў. У такіх выпадках якраз можа дапамагчы егіпецкая сіняя: фарбавальнік наносяць гэтак жа, як і звычайны парашок, а затым асвятляюць паверхню і фатаграфуюць з дапамогай камеры, аснашчанай фільтрам, адчувальным да інфрачырвонага выпраменьвання блізкага спектра. Калі адбіткі ёсць, яны будуць выразна відаць на здымку

**Наступны нумар «Звязды» выйдзе ў аўторак, 4 ліпеня.**

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.42 | 21.44 | 17.02 |
| Віцебск | 4.23 | 21.42 | 17.19 |
| Магілёў | 4.32 | 21.35 | 17.03 |
| Гомель | 4.38 | 21.22 | 16.44 |
| Гродна | 4.59 | 21.58 | 16.59 |
| Брэст | 5.09 | 21.49 | 16.40 |

**Месяц**

***Першая квадра ў 3.51.***
***Месяц у сузор'і Шаляў.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Васіля, Лявонція, Сяргея.*
***К.*** *Галіны, Рэгіны, Марціна, Юльяна.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

— Я сібірскай язвы не баюся, у мяне імунітэт.
— Што, перахварэў ужо?
— Ды не, у мяне жонка з Сібіры.

**Абітурыент, які марыў стаць лекарам, не здаў уступныя экзамены і ў найбліжэйшы год будзе марыць стаць генералам.**

У 100-гадовага дзядулі пытаюцца:
— А што вам кажуць лекары?
— А яны мне гадоў 50 адно і тое ж кажуць: кінь піць, кінь курыць, забудзь пра секс, перастань есці тлустае і салодкае.

**Жонка не вытрымала і навяла парадак на свой густ у нашым гаражы.**
**Ахоплены пачуццём удзячнасці, я няўзнак перамяшаў усё насенне ў пакеціках, прыгатаваных для пасадкі вясной.**




Малюнак Паўла ГАРАДОЎЦА і Міхася СТЭФАНЕНКІ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2390.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Нумар падпісаны ў 19.30 30 чэрвеня 2017 года.